НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

ЦЭНТРАЛЬНАЯ НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Я. КОЛАСА

ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ СТАРАДРУКАЎ І РУКАПІСАЎ

АДДЗЕЛ ДАСЛЕДАВАННЯ РУКАПІСАЎ

**ФОНД № 75**

# «ІВАШЫН ВАСІЛЬ УЛАДЗІМІРАВІЧ »

**ВОПІС № 1**

**Крайнія даты дакументаў вопісу:**

**1940 – 2009 гг. і б/д**

**Колькасць адзінак захавання ў вопісу:**

**161 (сто шэсцьдзесят адна)**

**Дата складання вопісу: жнівень 2025 г.**

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

**ЗМЕСТ**
**да вопісу № 1 фонду № 75**
**“Івашын Васіль Уладзіміравіч”**


| Назва раздзелаў | № адз. зах. | № стар. |
|---|---|---|
| **1. Творчыя дакументы В.У. Івашына** | **1 – 65** | **1-10** |
| 1.1 Артыкулы | 1 – 26 | 1–4 |
| 1.2. Рэцэнзіі | 27–32 | 4–5 |
| 1.3. Падручнікі па беларускай літаратуры і матэрыялы да іх | 33 – 52 | 5–8 |
| 1.4. Зборнікі вершаў і матэрылы да ніх | 53–59 | 8–9 |
| 1.5. Запісныя кніжкі і іншыя матэрыялы, якія адклаліся падчас творчай дзейнасці | 60–65 | 9 – 10 |
| **2. Дакументы навукова-педагагічнай і службовай дзейнасці** | **66–84** | **10–14** |
| **3. Перапіска** | **85–100** | **14–16** |
| 3.1. Пісьмы В.У Івашына | 85–88 | 14 |
| 3.2. Пісьмы да В.У. Івашына | 89–100 | 14–16 |
| 3.2.1. Розных асоб ( па алфавіце) | 89–95 | 14–15 |
| 3.2.2. Розных установ і арганізацый | 96–100 | 15–16 |
| **4. Дакументы да біяграфіі** | **101–140** | **16–23** |
| 4.1. Дакументы аб святкаванні юбілеяў | 101–126 | 16–20 |
| 4.2. Іншыя дакументы да біяграфіі | 127–140 | 20–23 |
| **5. Выяўленчыя дакументы** | **141–142** | **23–24** |
| **6. Дакументы пра В.У.Івашына** | **143–161** | **24–26** |


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

**СХЕМА**
**сістэматызацыі фонду № 75, вопіс № 1**
**“Івашын Васіль Уладзіміравіч”**

1. **Творчыя дакументы В.У. Івашына (1947 – 2007 і б/д)**
   1.1. Артыкулы ([1960-я гг.] – 2006 і б/д)
   1.2. Рэцэнзіі ([1959] – 2000 і б/д)
   1.3. Падручнікі па беларускай літаратуры (у сааўт.) і матэрыялы да іх ([1980-я гг.] – 2004 і б/д)
   1.4. Зборнікі вершаў і матэрыялы да іх (1994 – 2007 і б/д)
   1.5. Запісныя кніжкі і іншыя матэрыялы, якія адклаліся падчас творчай дзейнасці (1947 – 2003 і б/д)

2. **Дакументы навукова-педагагічнай і службовай дзейнасці (1954 – 2004 і б/д)**

3. **Перапіска (1959 – 2009 і б/д)**
   3.1. Пісьмы В.У. Івашына (па алфавіце) ([1976 – 2006] і б/д)
   3.2. Пісьмы да В.У. Івашына (1959 – 2009 і б/д)
      3.2.1. Розных асоб (па алфавіце) (1959 – 2007)
      3.2.2. Розных устаноў і арганізацый (1968 – 2009 і б/д)

4. **Дакументы да біяграфіі (1940 – 2009 і б/д)**
   4.1. Дакументы аб святкаванні юбілеяў (1963–2008)
      4.1.1. 50-годдзе з дня нараджэння (1963)
      4.1.2. 60-годдзе з дня нараджэння (1973)
      4.1.3. 70 і 75-годдзе з дня нараджэння (1983, 1988)
      4.1.4. 80 і 85-годдзе з дня нараджэння (1993, 1998)
      4.1.5. 90 і 95-годдзе з дня нараджэння (2003, 2008)
   4.2. Іншыя дакументы да біяграфіі (1940–2009 і б/д)

5. **Выяўленчыя дакументы ([1950-я гг.]; 1970)**

6. **Дакументы пра В.У. Івашына (1954–2003 і б/д)**

Навуковы супрацоўнік Т.І. Жук

Жнівень 2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# ДАВЕДКА
## аб жыцці і дзейнасці В.У. Івашына

**Васіль Уладзіміравіч Івашын** – беларускі літаратуразнавец і педагог. Нарадзіўся 9 мая 1913 г. у в. Ляхавічы Мінскага павета Мінскай губерніі (цяпер Дзяржынскі раён Мінскай вобласці) у сялянскай сям'і. У роднай вёсцы вучыўся ў пачатковай школе, скончыў Станькаўскую сямігодку і ў 1930 г. паступіў у Мінскі транспартна-эканамічны тэхнікум, які скончыў у 1933 г. У 1933–1934 гг. працаваў тэхнікам-эканамістам у сістэме Беларускай прамысловай кааперацыі. У 1934 г. паступіў на літаратурна-лінгвістычны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага. Пасля яго заканчэння ў 1938 г. быў накіраваны выкладчыкам мовы і літаратуры ў Віцебскае педагагічнае вучылішча, дзе працаваў да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. С першага да апошняга дня вайны В.У. Івашын заходзіўся ў дзеючай арміі, абараняў Вязьму, Ржэў, Маскву, з 1943 г. – на Варонежскім фронце. Дэмабілізаваўся ў снежні 1945 г.

У 1946–1949 гг. вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры АН БССР, адначасова працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Рэспубліканскай партыйнай школе пры ЦК КПБ. Пасля заканчэння аспірантуры ў 1949 г. В.У. Івашын пачаў працаваць навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры АН БССР, у 1951 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1963 г. – доктарскую. З 1954 па 1967 гг. загадваў сектарам беларускай савецкай літаратуры гэтага інстытута.

З 1967 г. В.У. Івашын – дырэктар, а з 1978 г. – старшы навуковы супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР. У 1967 г. В.У. Івашын быў абраны акадэмікам Акадэміі педагагічных навук СССР, уваходзіў у склад Прэзідыума АПН (1970–1979 гг.), з 1969 па 1979 г. быў членам калегіі Міністэрства асветы БССР. З 1995 па 2007 г. – галоўны навуковы супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі. Шмат часу прысвяціў В.У. Івашын падрыхтоўцы навуковых кадраў, кіраваў працай аспірантаў, падрыхтаваў 8 кандыдатаў навук, узначальваў камісію па здачы кандыдыцкага мінімуму ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, доўгі час працаваў у складзе савета па абароне дысертацый пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы. На працягу многіх гадоў быў членам калегіі газеты "Літаратура і мастацтва", членам рэдкалегіі энцыклапеды "Янка Купала", Рэдакцыйнага савета Беларускай савецкай энцыклапеды.

В 1995 г. В.У. Івашын быў абраны акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

З літаратурна-крытычнымі артыкуламі В.У. Івашын пачаў выступаць у друку з 1949 г. Асноўныя яго навуковыя працы прысвечаны пытанням гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры, праблемам развіцця рэалізму, беларуска-рускіх, беларуска-украінскіх літаратурных узаемасувязяў, метадалогіі і методыкі выкладання літаратуры ў школе.

Адным з важных накірункаў творчай дзейнасці В.У. Івашына з’яўляюцца педагагічныя даследаванні, сярод якіх “Вывучэнне рускай літаратуры ва ўзаемасувязі з беларускай” (сумесна з М. Лазаруком, Я. Ленсу, 1988), “З пазіцый гуманізму” (1988), “Праблемы літаратурнага навучання і эстэтычнага выхавання” (2003), а таксама шматлікія артыкулы тэарэтыка-метадалагічнага і праблемнага характару. В.У. Івашыну належыць шэраг кніг, брашур, дакладаў на міжнародных з’ездах славістаў; даследаванняў, выкананых у сааўтарстве, падручнікаў “Беларуская літаратура” для 8-га класа (з В.В. Барысенкам, 1978 г.; з М.А. Лазаруком, 1984 г.), для 9-га класа (з М.А. Лазаруком, 1994 г.), ён адзін з навуковых рэдактараў двухтомнай “Гісторыі беларускай савецкай літаратуры”. В.У. Івашын – аўтар звыш 300 навуковых прац, сярод якіх такія грунтоўныя манаграфіі, як “Янка Купала: Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905–1907 гг.”, “М. Горкі і беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя”, “Да вышынь рэалізму”, “Выверaная жыццём”, “Канцэпцыя рэфармавання літаратурнай адукацыі”, “З пазіцій гуманізму”.

У сталыя гады В.У. Івашын пачаў пісаць вершы, ён аўтар паэтычных зборнікаў “Слова” (1995), “Покліч памяці” (1998), “З надзеяй і верай” (2003), “Прызванне” (2007).

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1976), Айчыннай вайны II ступені (1985), медалямі.

Памёр В.У. Івашын 6 лістапада 2009 г.

*Літаратура:*
*Национальная академия наук Беларуси : персональный состав, 1928–2015 / сост.: Т.С. Буденкова [и др.] ; редсовет: В.Г. Гусаков (пред.) [и др.]. – 2-е изд., испр. – Минск : Беларуская навука, 2016. – С. 103 – 104.*
*Беларускія пісьменнікі : біябібліяграф. слоўнік : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Беларусі ; Беларус. энцыкл. ; Рэдкал.: І.Э. Багдановіч і інш. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі. – Т. 3 : Івашын - Кучар. – 1994. – С.5 – 8.*
*ЦНБ НАН Беларусі. ЦДСР. – Фонд 75. – Воп. 1. – Адз. зах. 136, 155, 158.*

Навуковы супрацоўнік Т.І. Жук

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# ДАВЕДКА
## аб складзе фонду № 75
## "Івашын Васіль Уладзіміравіч"

Матэрыялы асабістага архіва беларускага літаратуразнаўцы, педагога, акадэміка НАН Беларусі, акадэміка Акадэміі педагагічных навук СССР Васіля Уладзіміравіча Івашына паступілі ў ЦНБ НАН Беларусі ў чэрвені 2010 г. ад яго дачкі.

Пасля навукова-тэхнічнай апрацоўкі фонд налічвае 161 адзінку захавання за 1940–2009 гг. і складаецца з наступных асноўных груп дакументаў:

1. Творчыя документы. У гэту групу ўвайшлі артыкулы, прысвечаныя пытанням гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры, метадалогіі і методыкі выкладання літаратуры ў школе; водзывы і рэцэнзіі; матэрыялы да падручнікаў па беларускай літаратуры. Сярод творчых дакументаў – зборнікі вершаў і матэрыялы да іх, запісныя кніжкі і іншыя матэрыялы, якія адкладаліся падчас творчай дзейнасці В.У. Івашына.
2. Дакументы навукова-педагагічнай і службовай дзейнасці прадстаўлены пратаколамі пасяджэнняў Вучонага савета Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР, матэрыяламі аб удзеле В.У. Івашына ў рабоце спецыялізаваных саветаў па абароне кандыдацкіх дысертацый, праграмамі курса беларускай літаратуры і інш.
3. Перапіска В.У. Івашына з рознымі асобамі і ўстановамі.
4. У раздзел дакументаў да біяграфіі В.У. Івашына ўвайшлі матэрыялы аб святкаванні юбілеяў, дыпломы аб прысуджэнні вучоных ступеняў, пасведчанне акадэміка Акадэміі педагагічных навук, спісы навуковых прац, пасведчанні да медалёў, ганаровыя граматы і інш.
5. Выяўленчыя дакументы прадстаўлены фатаграфіямі В.У. Івашына з супрацоўнікамі Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР і сярод наведвальнікаў запаведніка "Сатаплія" у Грузіі.
6. У раздзел дакументаў пра В.У. Івашына ўвайшлі водзывы і рэцэнзіі розных асоб на яго навуковыя працы, артыкулы пра яго жыццё і творчую дзейнасць, вершы, прысвечаныя фондаўтваральніку.

Навуковы супрацоўнік Т.І. Жук

Жнівень 2025 г.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Дзяржаўная ўстанова “Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”
Фонд №___
Вопіс №___

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар дзяржаўнай установы “Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”
______________________________
___________________20_______

| № п/п | Загаловак справы | Дата (крайнія даты) справы | Коль-касць арку-шаў | Заўвага |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| | **1. Творчыя дакументы В.У. Івашына (1947 – 2007 і б/д )** | | | |
| | 1.1. Артыкулы ([1960-я гг.] – 2006 і б/д) | | | |
| 1. | [В.У. Івашын]. “Шаўчэнка і шляхі развіцця беларускай паэзіі”. Артыкул. 2 экз. Машынапіс з рукапіснымі праўкамі аўтара, на беларускай мове. | [1960-я гг.] | 45 | |
| 2. | “Палымянны вяшчальнік свабоды”. Артыкул, прысвечаны творчасці Я. Купалы. Машынапіс, на беларускай мове. | [пасля 1976] | 9 | |
| 3. | [В.У. Івашын]. “Выдатнае дасягненне шаўчэнказнаўства”. Артыкул. Машынапіс, на беларускай мове. | [1978] | 4 | |
| 4. | [В.У. Івашын]. “Канец 60-х – 70 гады”. Артыкул, прысвечаны станаўленню і развіццю НДІ педагогікі Міністэрства асветы БССР. Машынапіс, на беларускай мове. | [пасля 1978] | 15 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 5. | “Некаторыя аспекты выкладання літаратуры ў школе”. Артыкул. Чарнавік. Рукапіс, на беларускай мове. | [1970-я гг.] | 13 | |
| 6. | “Паэт высокай мастацкай культуры”. Артыкул, прысвечаны творчасці М. Багдановіча. Машынапіс, на беларускай мове. | [1970-я гг.] | 10 | |
| 7. | “Вывучэнне літаратуры на гісторыка-літаратурнай аснове як тэарэтыка-метадычная праблема”. Артыкул. Чарнавік. Рукапіс, на беларускай мове. | [пасля 1980] | 12 | |
| 8. | “Вывучэнне жыццёвай і творчай біяграфіі пісьменніка як тэарэтыка-метадычная праблема”. Артыкул. Варыянты. Машынапіс, на беларускай мове. | [пасля 1981] | 24 | |
| 9. | “Вывучэнне літаратуры ў сістэме гуманітарнай культуры”. Артыкул. Чарнавік. Рукапіс, на беларускай мове. | б/д [1980-я гг.?] | 10 | |
| 10. | “Уладзімір Дубоўка (1900–1976)”. Артыкул. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1980-я гг.?] | 44 | |
| 11. | “Роля эстэтычнага выхавання ў сістэме літаратурнай адукацыі”. Артыкул. 2 экз. Машынапіс з рукапіснымі праўкамі неўстаноўленай асобы, на беларускай мове. | б/д [1980-я – 1990-я гг.] | 19 | |
| 12. | “З пазіцый гуманізму. Актуалізацыя агульначалавечага зместу твораў беларускай класікі на ўроках літаратуры”. Артыкул. Выразка з неўстаноўленага выдання. Друк, на беларускай мове. | [1993] | 4 | |
| 13. | “У пошуках красы і гармоніі”. Артыкул. Машынапіс, на беларускай мове. | [1993] | 23 | |
| 14. | “Некаторыя аспекты вывучэння беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай”. Артыкул. Варыянты. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | [1994] | 14 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 15. | [В.У. Івашын]. “Вывучэнне літаратуры ў сістэме гуманітарнай культуры”. Артыкул. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [пасля 1996] | 7 | |
| 16. | «Асаблівасці паэмы “Новая зямля” Якуба Коласа ў кантэксце жанравых традыцый». Артыкул. Варыянты. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1999?] | 27 | |
| 17. | “Філасофская лірыка Янкі Купалы”. Артыкул. 3 экз. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | 29 | |
| 18. | “З пазіцый гуманізму”. Артыкул. Дакумент няпоўны, адсутнічае канчатак. Машынапіс з рукапіснымі праўкамі аўтара, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | 8 | |
| 19. | “Праблема нацыянальнага і агульначалавечага ў творчасці Максіма Багдановіча”. Артыкул. Варыянты. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | 27 | |
| 20. | “Міхаіл Арсеньевіч Лазарук (Да 75-годдзя з дня нараджэння)”. Асобны адбітак з часопіса “Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук”, № 2 за 2001 г. (5 экз.). Друк, на беларускай мове. | 2001 | 10 | |
| 21. | “Вернасць прызванню. 75 гадоў з дня нараджэння Міхася Лазарука”. Артыкул. Машынапіс, на беларускай мове. | [2001] | 5 | |
| 22. | “Вернасць прызванню”. Артыкул, прысвечаны навуковай дзейнасці М. Лазарука. Ксеракопія старонкі з газеты “Літаратура і мастацтва”, № 30 за 28 ліпеня 2006 г. Друк, на беларускай мове. | 28 ліпеня 2006 | 1 | |
| 23. | В.У. Івашын, М.А. Лазарук, А.І. Бельскі і інш. «Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура” (праект)». Часопіс “Беларуская мова і літаратура”, № 7 за 2006 г. Друк, на беларускай мове. | ліпень 2006 | 64 стар. | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 24. | "Асаблівасць гісторыка-літаратурнага курса (X–XI класы) у агульнай сістэме літаратурнай адукацыі". Артыкул. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [2000-я гг.?] | 4 | |
| 25. | "Асветніцкія ідэі ў творчасці Янкі Купалы". Артыкул. Чарнавікі. Рукапіс, машынапіс, на беларускай мове. | б/д [2000-я гг.?] | 10 | |
| 26. | "Гэта не забываецца…". Успаміны. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д | 3 | |
| | 1.2. Рэцэнзіі<br>([1959] – 2000 і б/д) | | | |
| 27. | [В.У. Івашын]. Рэцэнзія на кнігу П.П. Ахрыменкі, прысвечаную беларуска-украінскім літаратурным сувязям. Фрагмент. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1959?] | 5 | |
| 28. | Водзыў на манаграфію С.У. Калядка "Паэзія Яўгеніі Янішчыц: станаўленне творчай індывідуальнасці", прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. Машынапіс, на беларускай мове. | 10 кастрычніка 1999 | 7 | |
| 29. | Водзыў на дысертацыю В.М. Стральцовай "Беларуская аўтабіяграфічная проза канца XX стагоддзя як мастацкая сістэма", прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | 14 снежня 2000 | 12 | |
| 30. | Экспертнае заключэнне на дысертацыю М.А. Тычыны "Якуб Колас і руская літаратура першай паловы XIX стагоддзя", прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | 14 снежня 2000 | 4 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 31. | Экспертнае заключэнне на дысертацыю І.Л. Шаўляковай-Барзенка “Тэорыя літаратурных тропаў: метафара і сімвал (генезіс, эвалюцыя, тэндэнцыя развіцця)”, прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | б/д [пасля 2000] | 6 | |
| 32. | [В.У. Івашын]. “Водзыў на работу В.Л. Бечыка «Паэзія Аркадзія Куляшова», прызначанай да абароны ў якасці кандыдацкай дысертацыі”. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д | 6 | |
| | 1.3. Падручнікі па беларускай літаратуры (у суаўт.) і матэрыялы да іх ([1980-я гг.] – 2004 і б/д) | | | |
| 33. | “Беларуская літаратура пачатку XX ст.”. Раздзел да падручніка па беларускай літаратуры. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1980-я гг.] | 11 | |
| 34. | “Беларуская літаратура і еўрапейскі літаратурны працэс”. Раздзел да падручніка па беларускай літаратуры. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1980-я гг.] | 7 | |
| 35. | “Янка Купала (1882–1942)”. Раздзел да падручніка па беларускай літаратуры. Машынапіс з рукапіснымі праўкамі, на беларускай мове. | б/д [1980-я гг.] | 63 | |
| 36. | “Якуб Колас (1882–1956)”. Раздзел да падручніка па беларускай літаратуры. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1980-я гг.] | 22 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 37. | “Проза Якуба Коласа”, “Новая зямля” і інш. раздзелы да падручніка па беларускай літаратуры, прысвечаныя творчасці Я. Коласа. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1980-я – 1990-я гг.] | 30 | |
| 38. | “Беларуская літаратура пачатку XX ст.”. [Раздзел да новага падручніка па беларускай літаратуры для X класа агульнаадукацыйнай школы]. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | 187 | |
| 39. | “Максім Гарэцкі (1893–1939)”. [Раздзел да новага падручніка па беларускай літаратуры для X класа агульнаадукацыйнай школы]. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | 10 | |
| 40. | “Леся Украінка (1871–1913)”. [Раздзел да новага падручніка па беларускай літаратуры для X класа агульнаадукацыйнай школы]. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | 8 | |
| 41. | “Максім Багдановіч (1891–1917)”. [Раздзел да новага падручніка па беларускай літаратуры для X класа агульнаадукацыйнай школы]. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | 31 | |
| 42. | “Ядвігін Ш. (1869–1922)”. [Раздзел да новага падручніка па беларускай літаратуры для X класа агульна-адукацыйнай школы]. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | 4 | |
| 43. | “Цішка Гартны (1887–1937)”. [Раздзел да новага падручніка па беларускай літаратуры для X класа агульна-адукацыйнай школы]. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | 3 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 44. | “Змітрок Бядуля (1866–1941)”. [Раздзел да новага падручніка па беларускай літаратуры для X класа агульна-адукацыйнай школы]. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | 4 | |
| 45. | “Марыя Канапніцкая (1842–1910)”. [Раздзел да новага падручніка па беларускай літаратуры для X класа агульнаадукацыйнай школы]. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | 6 | |
| 46. | “Алесь Гарун (1887–1920)”. [Раздзел да новага падручніка па беларускай літаратуры для X класа агульна-адукацыйнай школы]. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.] | м12 | |
| 47. | [В.У. Івашын]. «Аўтарскі адказ на рэцэнзію Л.Д. Сіньковай аб даапрацоўцы падручніка для 10-га класа агульнаадукацыйнай школы “Беларуская літаратура” В.У. Івашына і М.А. Лазарука». 2 экз. Машынапіс, на беларускай мове. | 28 снежня 2000 | 8 | |
| 48. | [В.У. Івашын]. «Аўтарскі адказ на заключэнне А.І. Жураўскага аб рукапісе новай рэдакцыі падручніка для 10-га класа агульнаадукацыйнай школы “Беларуская літаратура” В.У. Івашына і М.А. Лазарука». 2 экз. Машынапіс, на беларускай мове. | 3 студзеня 2001 | 6 | |
| 49. | В.У. Івашын, М.А. Лазарук. “Беларуская літаратура. Падручнік для XI класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай і рускай мовамі навучання”. Частка І. | 2004 | 92 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Дадатак: заява В.У. Івашына на імя дырэктара Нацыянальнага інстытута адукацыі У.П. Пархоменкі з просьбай прыняць да разгляду рукапіс згаданага падручніка. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | | | |
| 50. | В.У. Івашын, М.А. Лазарук. “Беларуская літаратура. Падручнік для XI класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай і рускай мовамі навучання”. Частка II. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | 2004 | 117 | |
| 51. | В.У. Івашын, М.А. Лазарук. “Беларуская літаратура. Падручнік для XI класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай і рускай мовамі навучання”. Частка III. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | 2004 | 109 | |
| 52. | В.У. Івашын, М.А. Лазарук. “Беларуская літаратура. Падручнік для XI класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай і рускай мовамі навучання”. Частка IV. Машынапіс, рукапіс, друк, на беларускай мове. | 2004 | 108 | |
| | 1.4. Зборнікі вершаў і матэрыялы да іх (1994 – 2007 і б/д) | | | |
| 53. | “Слова”. Зборнік вершаў. Вёрстка зборніка з рэдактарскімі праўкамі. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | 1994 | 150 | |
| 54. | “З надзеяй і верай”. Зборнік вершаў. Варыянт. Машынапіс, на беларускай мове. | [2003] | 82 | |
| 55. | Вершы, якія ўвайшлі ў зборнік “З надзеяй і верай”. Чарнавікі, варыянты. Рукапіс, на беларускай мове. | [2003] | 41 | |
| 56. | “Прызванне”. Рукапісный варыянт зборніка вершаў, на беларускай мове. | [2007] | 65 | |
| 57. | “Прызванне”. Зборнік вершаў. Варыянт. Машынапіс з рукапіснымі праўкамі і | [2007] | 38 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | ўстаўкамі, на беларускай мове. | | | |
| 58. | Вершы “Кудысці ў даль плывуць гады…”, “У далёкім блізкае знайсці я рады…”, “Жыццё”, “Шчасце”, “Жаданне”, “Песня” і інш. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я – 1-я пал. 2000-х гг.] | 48 | |
| 59. | Чарнавыя накіды і варыянты розных вершаў (“Вясна”, “Памяць душы”, “Шчасце”, “Водар вясны”, “Надзеі, мары, спадзяванні…”,”Ці помніш ты такі шчаслівы час…”, “Дарогі, вечныя дарогі…” і інш). Рукапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я – 1-я пал. 2000-х гг.] | 47 | |
| | 1.5. Запісныя кніжкі і іншыя матэрыялы, якія адкладаліся падчас творчай дзейнасці (1947–2003 і б/д) | | | |
| 60. | Матэрыялы (архіўныя выпіскі, запісы, фотакопія артыкула, асобны нумар літаратурнай газеты і інш.) аб жыцці і творчай дзейнасці Т. Шаўчэнкі, сабраныя В.У. Івашыным. Рукапіс, машынапіс, друк, фатаграфія, на рускай, беларускай, украінскай мовах. | 1947 – [1964] і б/д | 8 | |
| 61. | Запісныя кніжкі, блакнот з накідамі вершаў, артыкулаў, іншымі запісамі творчага характару. Рукапіс, на беларускай мове. | б/д [1970-я – 1980-я гг. ] | 158 | |
| 62. | “Свабода”. Выпіскі, нататкі, запісы і інш. да артыкула пра сувязі паэта і народа. Рукапіс, на рускай, беларускай мовах. | 1988 і б/д | 7 | |
| 63. | Выпіскі, нататкі, запісы творчага характару. Рукапіс, машынапіс, на беларускай, рускай мовах. | б/д [1980-я гг. ] | 10 | |
| 64. | Чарнавыя накіды артыкулаў, прысвечаных пытанням узаемасувязі паміж літаратурай і іншымі відамі мастацтва, прынцыпам літаратурнай | б/д [1990-я – 2000-я гг. ] | 24 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | адукацыі і інш. Рукапіс, на беларускай мове. | | | |
| 65. | Матэрыялы (змест, слова ад аўтара, чарнавыя накіды і інш.) да зборніка артыкулаў “Праблемы літаратурнай адукацыі”. Рукапіс, машынапіс, на беларускай мове. | 2003 | 13 | |
| | **2. Дакументы навукова-педагагічнай і службовай дзейнасці (1954 – 2004 і б/д)** | | | |
| 66. | Пратакол пасяджэння Аб’яднанага вучонага савета Інстытута мовазнаўства і Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР адносна вылучэння кнігі В.У. Івашына “Янка Купала: творчасць перыяду рэвалюцыі 1905–1907 гг.” на атрыманне Сталінскай прэміі за 1953 г. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 27 студзеня 1954 | 4 | |
| 67. | Выпіска з пратакола пасяджэння Вучонага савета Інстытута літаратуры імя Я. Купалы аб рэкамендацыі кнігі В.У. Івашына “У истоков социалистического реализма” да абароны ў якасці дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Машынапіс, на рускай мове. | 12 кастрычніка 1963 | 6 | |
| 68. | “Список кандидатов наук, выполнивших диссертации под научным руководством Ивашина Василия Владимировича”. Машынапіс, на рускай мове. | [пасля 1971] | 1 | |
| 69. | Праекты заключэнняў спецыялізаваных саветаў па абароне кандыдацкіх дысертацый пры Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце і Беларускім | [1970-я – 1990-я гг.] | 12 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | дзяржаўным універсітэце, падрыхтаваныя рознымі асобамі, і іншыя дакументы аб працы В.У. Івашына ў спецыялізаваных саветах. Машынапіс, рукапіс, на беларускай, рускай мовах. | | | |
| 70. | Заява В.У. Івашына на імя Старшыні Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтв, паліграфіі і кніжнага гандлю М.І. Дзяльца адносна выдання манаграфіі "К высотам реализма. Основные тенденции развития белорусской дооктябрьской и советской литературы". Машынапіс, на рускай мове. | 10 чэрвеня 1982 | 2 | |
| 71. | Праграма па беларускай літаратуры для Х класа агульнаадукацыйнай школы. (У тэксце – рукапісныя праўкі В.У. Івашына). Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1980-я гг.?] | 14 | |
| 72. | "Літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (1946–1956)", "Літаратура на сучасным этапе". Праграма курса беларускай літаратуры, складзеная Т. Грамадчанка. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.?] | 26 | |
| 73. | "Сусветная літаратура. 10 клас". Праграма і змест праграмнага матэрыялу. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | б/д [1990-я гг.?] | 23 | |
| 74. | Справаздачы вядучага навуковага супрацоўніка НДІ адукацыі В.У. Івашына аб навукова-даследчай рабоце за розныя гады. Машынапіс, рукапіс, на рускай, беларускай мовах. | 1991 – 2000 і б/д | 18 | |
| 75. | Пісьмо В.У. Івашына на імя прэзідэнта АН Беларусі Л.М. Сушчэні з просьбай далучыць яго да Аддзялення гуманітарных навук з правам дарадчага голасу. Копія. | 11 мая 1993 | 1 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Машынапіс, на беларускай мове. | | | |
| 76. | “Даведка аб кандыдаце ў ганаровыя члены НАН Беларусі Зуёнку Васілю Васільевічу”. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1999?] | 1 | |
| 77. | Праект Пастановы вучонага савета Нацыянальнага інстытута адукацыі па дакладу намесніка дырэктара па навуковай рабоце А.Е. Лісейчыкава “Тэарэтычныя падыходы і асаблівасці пабудовы адукацыйнага стандарта 12-гадовай школы”. Машынапіс, на беларускай мове. | 12 ліпеня 2001 | 3 | |
| 78. | Выдавецкія договоры В.У. Івашына і М.А. Лазарука (спадкаемніца Т.К. Лазарук) з выдавецтвам “Народная асвета” на стварэнне, выданне і перавыданне падручніка “Беларуская літаратура, 10 кл.”, ч. І і ІІ (для дзяцей са слабым зрокам). Друк, на рускай мове. | 12 чэрвеня 2002 | 4 | |
| 79. | Кантракт, заключаны навукова-метадычнай установай “Национальный институт образования” з В.У. Івашыным, на работу галоўным навуковым супрацоўнікам у лабараторыю тэорыі і методыкі навучання беларускай мове і літаратуры тэрмінам на год з 2002 па 2003 гг. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 1 лістапада 2002 | 2 | |
| 80. | “Заключэнне Секцыі філалагічных дысцыплін Конкурснай камісіі адкрытага конкурсу на стварэнне падручнікаў па сацыяльна-гуманітарных прадметах для агульнаадукацыйных школ Рэспублікі Беларусь”. Сярод конкурсных падручнікаў | б/д [2002] | 4 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | – “Беларуская літаратура, 10 кл.” В.У. Івашына і М.А. Лазарука. Друк, на беларускай мове. | | | |
| 81. | Запрашальныя білеты Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальнага інстытута адукацыі, іншых установаў на ўдзел В.У. Івашына ў розных мерапрыемствах. Сярод дакументаў - запрашэнне В.У. Івашына на сустрэчу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі з членамі Агульнага сходу НАН Беларусі. Друк, рукапіс, на рускай, беларускай мовах. | 24 студзеня 2003 – 15 кастрычніка 2004 | 8 | |
| 82. | “Беларуская літаратура (базавы ўзровень). Эксперыментальная праграма для 11 класа 12-гадовай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы”. Праграму падрыхтавалі М.А. Лазарук, В.У. Івашын, А.І. Бельскі, В.В. Кушнярэвіч, Л.К. Цітова. Машынапіс, на беларускай мове. | 2004 | 20 | |
| 83. | “Аб зменах у дзеючай Праграме па беларускай літаратуры для VIII–XI класаў школ з паглыбленым вывучэннем літаратуры”. Праект праграмы падрыхтаваны выкладчыкамі БДУ. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [2000-я гг.] | 11 | |
| 84. | Праект экспертнага заключэння Спецыялізаванага савета па дысертацыі У.А. Коваля “Мастацкі свет драматургіі Францішка Аляхновіча”. Праект падрыхтаваны членам Савета В.У. Івашыным. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | б/д [2000-я гг.] | 5 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **3. Перапіска (1959 – 2009 і б/д)** | | | |
| | 3.1. Пісьмы В.У. Івашына (па алфавіце) ([1976 – 2006] і б/д) | | | |
| 85. | Пісьмо, адрасаванае Эдзі Сямёнаўне [Агняцвет]. Чарнавік. Рукапіс, на беларускай мове. | б/д [пасля 1983] | 1 | |
| 86. | Пісьмо, адрасаванае Эсфір Саламонаўне [Гурэвіч]. Чарнавік. Рукапіс, на беларускай мове. | б/д [1997?] | 1 | |
| 87. | Пісьмы, адрасаваныя прэзідэнту Расійскай акадэміі адукацыі М.Д. Нікандраву, са звесткамі біяграфічнага характару. Чарнавікі. Рукапіс, на рускай мове. | [2006] і б/д | 3 | |
| 88. | Пісьмо, адрасаванае Анатолю Аляксандравічу [Смірнову]. Копія. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1976 ] | 1 | |
| | 3.2. Пісьмы да В.У. Івашына (1959 – 2009 і б/д) | | | |
| | 3.2.1. Розных асоб (па алфавіце) (1959 – 2007) | | | |
| 89. | Віншавальныя паштоўкі Барысенкі Васіля [Васільевіча]. Рукапіс, на беларускай, рускай мовах. | 1983 | 3 | |
| 90. | Віншавальныя паштоўкі Васілевіча Г.А., старшыні Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь. Друк, на рускай мове. | [2002, 2005] | 3 | |
| 91. | Пісьмо Венцлава [Антанаса]. Да пісьма дададзены фотакопіі снімка Я.Коласа, А. Хорава і А. Венцлава на 1-й Усесаюзнай канферэнцыі прыхільнікаў міру ў Маскве ў 1949 г. Рукапіс, фатаграфія, на рускай мове. | 14 лістапада 1959 | 4 | |
| 92. | Пісьмо Гінтаўта Франца Віктаравіча. Рукапіс, на беларускай мове. | 28 лютага 1984 | 1 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 93. | Пісьмы Гурэвіч [Эсфір Саламонаўны] і яе сям'і. Рукапіс, на беларускай мове. | 17 красавіка 1998 – красавік 2002 | 3 | |
| 94. | Пісьмы прэзідэнта Расійскай акадэміі адукацыі Нікандрава [Мікалая Дзмітрыевіча], адрасаваныя В.У. Івашыну, з нагоды абрання яго замежным членам РАА і запрашэннем прыняць удзел у рабоце Агульнага сходу РАА. Друк, рукапіс, на рускай мове. | 19 красавіка 1999 – 30 студзеня 2007 | 4 | |
| 95. | Віншавальныя паштоўкі розных асоб (супрацоўнікаў Інстытута літаратуры АН БССР, настаўнікаў і вучняў 7 гімназіі), адрасаваныя В.У. Івашыну з нагоды яго дня нараджэння і ў сувязі з дзяржаўнымі святамі. Рукапіс, друк, на рускай, беларускай мовах. | [1970-я гг.] – 2003 | 3 | |
| | 3.2.2. Розных устаноў і арганізацый (1968 – 2009 і б/д) | | | |
| 96. | Пісьмо Варашылаўскага райкама КПБ г. Мінска, адрасаванае В.У. Івашыну, з падзякай за працу па прапагандзе марксісцка-ленінскіх ведаў і камуністычным выхаванні працоўных. Друк, рукапіс, на рускай мове. | 11 лістапада 1968 | 1 | |
| 97. | Віншавальныя паштоўкі розных устаноў, адрасаваныя В.У. Івашыну, з нагоды Дня Перамогі і іншых свят. Друк, рукапіс, на беларускай, рускай мовах. | 1975 – 2009 | 10 | |
| 98. | Віншавальныя паштоўкі дырэкцыі і калектыву супроцоўнікаў Нацыянальнага інстытута адукацыі, адрасаваныя В.У. Івашыну, з нагоды Дня Перамогі і запрашэннем прыняць удзел святочных мерапрыемствах. Друк, на рускай, беларускай мовах. | 4 мая 1995 – 9 мая 2007 | 6 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 99. | Пісьмы дырэктара Нацыянальнага інстытута адукацыі, адрасаваныя В.У. Івашыну, з падзякай за сумесную 40-гадовую працу, прапановай працаваць кансультантам па пытаннях сучаснай літаратурнай адукацыі і віншаваннямі з нагоды 80-годдзя згаданага інстытута. | 2007, [2009] | 2 | |
| 100. | Пісьмо першага намесніка старшыні Беларускага Таварыства “Кніга” У. Лапцёнка, адрасаванае В.У. Івашыну, з просьбай даць адказы на пытанні анкеты для кнігі “Шчыра як на духу. Споведзі вядомых людзей Беларусі”. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [2000-я гг.] | 2 | |
| | **4. Дакументы да біяграфіі (1940 – 2009 і б/д)** | | | |
| | 4.1. Дакументы аб святкаванні юбілеяў (1963 – 2008) | | | |
| | 4.1.1. 50-годдзе з дня нараджэння (1963) | | | |
| 101. | Віншавальныя паштоўкі розных асоб (М. Лынькоў, А. Асіпенка, У. Юрэвіч) з нагоды 50-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Рукапіс, на беларускай мове. | 25–27 красавіка 1963 | 3 | |
| 102. | Віншавальныя пісьмы калектыву супрацоўнікаў Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР і Літаратурнага музея Янкі Купалы АН БССР з нагоды 50-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | 26 красавіка 1963 і б/д | 2 | |
| 103. | Віншавальны адрас беларускіх пісьменнікаў з нагоды 50-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | [красавік 1963] | 2 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 104. | Віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР з нагоды 50-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Рукапіс, на беларускай мове. | 1963 | 2 | |
| | 4.1.2. 60-годдзе з дня нараджэння (1973) | | | |
| 105. | Віншавальныя адрасы калектыву супрацоўнікаў Інстытута педагогікі, Рэспубліканскага інстытута ўдасканалення настаўнікаў і Рэспубліканскай навукова-педагагічнай бібліятэкі з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Рукапіс, на беларускай, рускай мовах. | 26 красавіка 1973 | 6 | |
| 106. | Ганаровая грамата Мінскай вышэйшай партыйнай школы, выдадзеная В.У. Івашыну за актыўны ўдзел у рабоце кафедры журналістыкі і літаратуры Мінскай ВПШ і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння. Рукапіс, друк,на рускай мове. | 26 красавіка 1973 | 2 | |
| 107. | Віншавальны адрас калектыву Мінскага гарадского інстытута ўдасканалення настаўнікаў з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. (На папцы – металічная накладка з выгравіраваным надпісам). Машынапіс, на рускай мове. | 27 красавіка 1973 | 2 | |
| 108. | Віншавальнае пісьмо супрацоўнікаў Літаратурнага музея Янкі Купалы з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння і 35-годдзя навукова-педагагічнай дзейнасці В.У. Івашына, і партрэт Я. Купалы работы мастака Я. Раманоўскага з дарчым надпісам: “Ад родных паэта”. Літаграфія, машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | 27 красавіка 1973 | 2 | |
| 109. | Віншавальны адрас Прэзідыума Акадэміі педагагічных навук СССР з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння і 35-годдзя | [красавік 1973] | 2 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | педагагічнай і навуковай дзейнасці В.У. Івашына. Рукапіс, машынапіс, на рускай мове. | | | |
| 110. | Віншавальны адрас кафедры рускай і замежнай літаратуры Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. (На папцы – металічная накладка з выгравіраваным надпісам). Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | [красавік 1973] | 3 | |
| 111. | Віншавальны адрас беларускіх пісьменнікаў з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | [красавік 1973] | 2 | |
| | 4.1.3. 70 і 75-годдзе з дня нараджэння (1983, 1988) | | | |
| 112. | Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР, выдадзеная В.У. Івашыну з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | 19 мая 1983 | 2 | |
| 113. | Віншавальны адрас беларускіх пісьменнікаў з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | [1983] | 2 | |
| 114. | Віншавальны адрас выкладчыкаў і студэнтаў філалагічнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Рукапіс, на беларускай мове. | [1983] | 2 | |
| 115. | Віншавальныя адрасы калектыву супрацоўнікаў Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР з нагоды 70 і 75-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Рукапіс, машынапіс, на беларускай мове. | [1983, 1988] | 4 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 116. | Віншавальны адрас супрацоўнікаў Навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР з нагоды 75-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. (На папцы – металічная накладка з выгравіраваным надпісам). Рукапіс, на беларускай мове. | 9 мая 1988 | 3 | |
| 117. | Віншавальны адрас Праўлення Саюза пісьменнікаў БССР з нагоды 75-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | [1988] | 2 | |
| | 4.1.4. 80 і 85-годдзе з дня нараджэння (1993, 1998) | | | |
| 118. | Віншавальны адрас супрацоўнікаў Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Рукапіс, машынапіс, на беларускай мове. | [красавік] 1993 | 2 | |
| 119. | Віншавальны адрас Саюза пісьменнікаў БССР з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Рукапіс, на беларускай мове. | [красавік 1993] | 2 | |
| 120. | Ганаровая грамата Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выдадзеная В.У. Івашыну за вялікі ўклад у развіццё беларускага літаратуразнаўства, метадалогіі і методыкі выкладання літаратуры ў школе, падрыхтоўку навуковых кадраў і ў сувязі з 85-годдзем з дня нараджэння. Дадатак: копія пастановы Бюро Прэзідыума НАН Беларусі аб узнагароджанні В.У. Івашына згаданай граматай. Друк, машынапіс, на беларускай мове. | 24 красавіка 1998 | 3 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 121. | Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, выдадзеная В.У. Івашыну за шматгадовую плённую працу ў сістэме адукацыі і ў сувязі з 85-годдзем з дня нараджэння. Друк, машынапіс, на беларускай мове. | 29 красавіка 1998 | 3 | |
| 122. | Прывітальнае слова і віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Нацыянальнага інстытута адукацыі з нагоды 85-годдзя з дня нараджэння. В.У. Івашына. Рукапіс, друк, на беларускай мове. | [1998] | 5 | |
| 123. | Віншавальны адрас Саюза беларускіх пісьменнікаў з нагоды 85-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Машынапіс, на беларускай мове. | [1998] | 2 | |
| 124. | Віншавальнае пісьмо міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь В.І. Стражава з нагоды 85-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Друк, на беларускай мове. | [1998] | 1 | |
| | 4.1.5. 90 і 95-годдзе з дня нараджэння (2003, 2008) | | | |
| 125. | Віншавальны адрас Прэзідыума і Адзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з нагоды 90-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Машынапіс, на беларускай мове. | красавік 2003 | 2 | |
| 126. | Віншавальныя пісьмы, тэлеграмы і паштоўкі розных асоб і арганізацый з нагоды 90 і 95-годдзя з дня нараджэння В.У. Івашына. Рукапіс, машынапіс, на беларускай, рускай мовах. | 25 красавіка 2003 – май 2008 | 9 | |
| | 4.2. Іншыя дакументы да біяграфіі (1940 – 2009 і б/д) | | | |
| 127. | Дакументы В.У. Івашына (дыплом аб заканчэнні літаратурна-лінгвістычнага факультэта Мінскага дзяржаўнага | 1940 – 1980 | 13 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага, дыпломы кандыдата і доктара філалагічных навук, атэстат прафесара, пасведчанне акадэміка Акадэміі педагагічных навук і інш.) біяграфічнага характару. Копіі. Машынапіс, рукапіс, ксеракс, на рускай, беларускай мовах. | | | |
| 128. | Выпіска з пратакола пасяджэння Вучонага савета Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР аб прысуджэнні В.У. Івашыну вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 9 мая 1951 | 1 | |
| 129. | Пасведчанні да медалёў удзельніка IV Міжнароднага з’езда славістаў, удзельніка ВДНГ СССР, медаля “65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў” і паведамленне ваеннага камісара Першамайскага раёна г. Мінска аб узнагароджанні В.У. Івашына ордэнам Айчыннай вайны II ступені. Друк, рукапіс, на рускай, беларускай мовах. | верасень 1958; 23 ліпеня 1981 – 16 чэрвеня 2009 | 6 | |
| 130. | “Характеристика-рекомендация на заведующего сектором белорусской литературы Института литературы им. Янки Купалы АН БССР Ивашина Василия Владимировича”. Характарыстыка выдана для ўдзелу ў рабоце V Міжнароднага з’езда славістаў. Машынапіс, на рускай мове. | 1963 | 1 | |
| 131. | Спіскі навуковых прац В.У. Івашына за розныя гады. Машынапіс, рукапіс, на рускай, беларускай мовах. | 1968 – 1999 | 17 | |
| 132. | Пісьмо міністра асветы БССР М. Мінкевіча ў Вышэйшую атэстацыйную камісію пры Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй адукацыі СССР з хадайніцвам аб прысваенні В.У. Івашыну вучонага звання | 17 лістапада 1972 | 1 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | прафесара па спецыяльнасці літаратура народаў СССР. Копія. Машынапіс, на рускай мове. | | | |
| 133. | Ганаровая грамата Маскоўскага райкама КПБ г. Мінска, выдадзеная В.У. Івашыну за актыўную працу па камуністычнаму выхаванню працоўных. Друк, машынапіс, на рускай мове. | 15 чэрвеня 1978 | 2 | |
| 134. | Дакументы В.У. Івашына (асабісты лісток па ўліку кадраў, уліковая картка доктара навук і старэйшага навуковага супрацоўніка-кансультанта, анкета і інш.) біяграфічнага характару. Машынапіс, рукапіс, на рускай, англійскай мовах. | 1981 – 1999 і б/д | 9 | |
| 135. | "Васіль Івашын", "Васіль Уладзіміравіч Івашын". Даведкі пра акадэміка Акадэміі педагагічных навук СССР В.У. Івашына. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | [1983 – 2003] і б/д | 15 | |
| 136. | Аўтабіяграфія В.У. Івашына. Машынапіс, на беларускай мове. | 15 мая 1993 | 2 | |
| 137. | Ганаровая грамата Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выдадзеная В.У. Івашыну за вялікі ўклад у справу перамогі над фашызмам, самаадданую працу ў мірныя гады і ў сувязі з 50-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | 5 мая 1995 | 2 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 138. | Ганаровая грамата Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, выдадзеная галоўнаму навуковаму супрацоўніку лабараторыі літаратурнай адукацыі В.У. Івашыну за значны ўклад у правядзенне навуковых даследаванняў у галіне адукацыі, іх арганізацыйнае і матэрыяльнае забеспячэнне і ў сувязі з 70-годдзем з дня заснавання інстытута. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | 25 лістапада 1999 | 3 | |
| 139. | Ганаровыя граматы Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, выдадзеныя В.У. Івашыну за шматгадовую і плённую працу ў інстытуце, высокія дасягненні ў навукова-даследчай дзейнасці і падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | 15 мая 2003, 24 красавіка 2007 | 4 | |
| 140. | Ганаровая грамата Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выдадзеная галоўнаму навуковаму супрацоўніку Навукова-метадычнай установы “Нацыянальны інстытут адукацыіі” В.У. Івашыну за вялікі ўклад у беларускае літаратуразнаўства, тэарэтыка-метадалагічнае і вучэбна-метадычнае забеспячэнне літаратурнай адукацыі. Друк, на беларускай мове. | 4 кастрыч-ніка 2004 | 1 | |
| | **5. Выяўленчыя дакументы ([1950-я гг.]; 1970)** | | | |
| 141. | Фотаздымак супрацоўнікаў Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. (Сярод іншых – В. Івашын, М. Лынькоў, П. Броўка, В. Барысенка, Ю. Пшыркоў). | [1950-я гг.] | 1 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 142. | Фотаздымкі В.У. Івашына ў групе з наведвальнікамі запаведніка “Сатаплиа” (Грузія). | 1970 | 2 | |
| | **6. Дакументы пра В.У. Івашына (1954 – 2003 і б/д)** | | | |
| 143. | “Отзыв сектора Белорусской советской литературы Института литературы и искусства Академии наук БССР о книге В.В. Ивашина «Янка Купала. Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905–1907 гг.», Минск, 1953 г.” Машынапіс, на рускай мове. | 1 лютага 1954 | 3 | |
| 144. | Н. Пятровіч. “Отзыв о монографии В.В. Ивашина «Янка Купала. Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905–1907 гг.»”. Машынапіс, на рускай мове. | 2 лютага 1954 | 3 | |
| 145. | У.Ф. Луцэвіч, І.К. Жыдовіч. Водзыў на кнігу В.У. Івашына «Янка Купала. Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905–1907 гг.». Машынапіс, на рускай мове. | 2 лютага 1954 | 2 | |
| 146. | “Отзыв кафедры русского языка и литературы Республиканской партийной школы при ЦК КП Белоруссии на книгу В.В. Ивашина «Янка Купала. Творчасць перыяду рэвалюцыі: 1905–1907 гг.», Выдавецтва АН БССР, Мінск, 1953, стр. 208”. Машынапіс, на рускай мове. | 4 лютага 1954 | 2 | |
| 147. | І. Ралько. “Па рознаму ў розную пору…”. Верш, прысвечаны В.У. Івашыну з нагоды 50-годдзя з дня яго нараджэння. Машынапіс, на беларускай мове. | [1963] | 1 | |
| 148. | Н. Пятровіч. Водзыў на работу В.У. Івашына “У истоков социалистического реализма”. Машынапіс, на рускай мове. | [1963] | 2 | |
| 149. | Я. Герцовіч. Рэцэнзія на работу В.У. Івашына “Творчая індывідуальнасць | 13 сакавіка 1967 | 6 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | пісьменніка і традыцыя (тэарэтычны нарыс)”. Машынапіс, на беларускай мове. | | | |
| 150. | В. Іванісенка. Водзыў на кнігу В.У. Івашына “У истоков социалистического реализма”, прадстаўленую на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Машынапіс, на рускай мове. | [1960-я гг.] | 2 | |
| 151. | М.А. Лазарук. Даведка пра В.У. Івашына біяграфічнага характару. Аўтарызаваны машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1983?] | 1 | |
| 152. | В. Жураўлёў. “Эстэтыка рэалізму”. Водзыў на кнігу В.У. Івашына “Да вышынь рэалізму. Асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай дакастрычніцкай і савецкай літаратуры”. Выразка з газеты “Звязда” за 20 лістапада 1984 г. Друк, на беларускай мове. | 20 лістапада 1984 | 1 | |
| 153. | Бібліяграфічная частка артыкула, прысвечанага В.У. Івашыну, які рыхтаваўся для “Бібліяграфічнага слоўніка беларускіх пісьменнікаў”, і суправаджальнае пісьмо А.І. Мальдзіса і М.П. Барташэвіч да В.У. Івашына. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | [пасля 1988] | 24 | |
| 154. | А. Гуцалюк. “Вочы паэта”, “Вам, мастеру, – от подмастерья…”. Вершы, прысвечаныя В.У. Івашыну. Машынапіс, ксеракс, на рускай, беларускай мовах. | 1 сакавіка – 9 мая 1998 | 3 | |
| 155. | Артыкулы, прысвечаныя жыццю і творчай дзейнасці В.У. Івашына. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [1998] | 7 | |
| 156. | У. Гніламёдаў. “Працяг дыялогу”. Прадмова да зборніка вершаў В.У. Івашына “Покліч памяці”. Рукапіс, на беларускай мове. | б/д [1998] | 5 | |
| 157. | М.М. Караткоў. “Рэцэнзія на рукапіс падручніка па беларускай літаратуры для 10 класа сярэдняй агульнаадукацыйнай | 16 студзеня 2003 | 40 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | школы, прадстаўленага на конкурс на стварэнне падручнікаў па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах для агульнаадукацыйнай школы”. Машынапіс, на беларускай мове. | | | |
| 158. | В.П. Жураўлёў. Артыкул “Васіль Уладзіміравіч Івашын. (Да 90-годдзя з дня нараджэння)”. Асобны адбітак з часопіса “Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук”, № 2 за 2003 г. Друк, на беларускай мове. | 2003 | 3 | |
| 159. | У. Гніламёдаў. “Закаханы ў жыццё”. Прадмова да зборніка вершаў В.У. Івашына “З надзеяй і верай”. Рукапіс, на беларускай мове. | [2003] | 12 | |
| 160. | Г.Г. Макейчык, З.П. Бацькова. “Рэцэнзія на рукапіс падручніка «Беларуская літаратура» для 10 класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай і рускай мовамі навучання аўтараў В.У. Івашына і М.А. Лазарука”. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [2003?] | 7 | |
| 161. | Я.А. Гарадніцкі. “Рэцэнзія на рукапіс В.У. Івашына і М.А. Лазарука «Беларуская літаратура: падручнік для 10 класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай і рускай мовамі навучання»”. Машынапіс, на беларускай мове. | б/д [2003?] | 4 | |

У дадзены вопіс унесена **161** ***(сто шэсцьдзясят адна)*** справа
з № **1** па № **161**, у тым ліку:
літарныя нумары: -
прапушчаныя нумары: -



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Навуковы супрацоўнік аддзела даследавання рукапісаў — Т.І. Жук

Загадчык аддзела даследавання рукапісаў — В.В.Урублеўскі

«____»__________2025 г.

УЗГОДНЕНА
Пратакол ФК № ____ ад ___________



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

ЛІСТ-ЗАВЯРАЛЬНІК ВОПІСУ № 1 (Ф. № 75)

У дадзеным вопісу пранумеравана ***27 (дваццаць сем)*** аркушоў + ***I –V*** аркушоў уводнай часткі, у тым ліку:

літарныя нумары: ______________________________

прапушчаныя нумары: ______________________________

| Асаблівасці фізічнага стану і фарміравання вопісу | Нумары аркушоў вопісу |
|---|---|
| 1 | 2 |
| Да вопісу далучана ўводная частка (змест, схема сістэматызацыі, даведка аб фондаўтваральніку і складзе фонду). | I–V |

Навуковы супрацоўнік Т.І. Жук

27.08.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by